*Рыжкова Л. М.,*

кіраўнік узорнага фальклорнага ансамбля «Калыханка» Міханавіцкага цэнтра фальклору і традыцыйнай культуры, старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

# АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ ТРАДЫЦЫЙНАГА БЕЛАРУСКАГА ВАКАЛЬНА-ХАРАВОГА МАСТАЦТВА: ЭЛЕМЕНТЫ ТЭАТРАЛЬНАЙ СІСТЭМЫ К. С. СТАНІСЛАЎСКАГА Ў ПРАКТЫЦЫ РАБОТЫ ДЗІЦЯЧАГА ФАЛЬКЛОРНАГА АНСАМБЛЯ «КАЛЫХАНКА»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ансамбль «Калыханка» з 1989 г. вывучае беларускае традыцыйнае песеннае мастацтва. У рэпертуары ансамбля песні ўсіх жанраў і рэгіёнаў Беларусі. Гэта тлумачыцца тым, што ў пасёлку Міханавічы, які ўзнік у 1940-х гг., жывуць выхадцы з многіх рэгіёнаў не толькі Беларусі, але і ўсяго былога Савецкага Саюза.

Першапачаткова і да гэтага часу ансамбль вывучае фальклор вусным шляхам, «на слых», «з голасу» таго ці іншага народнага выканаўцы (па запісу) на электронных носьбітах. Этап расшыфроўкі і развучвання з нот адсутнічае. Музыказнаўчая тэрміналогія не выкарыстоўваецца.

Дзякуючы шматгадоваму слуханню народных песень дзеці адчуваюць у мінулы час як блізкі нам. Тлумачыцца ён з пазіцыі сённяшняга дня. Напрыклад, уражанні ад цыклону Хаўер, які пранёсся вясной 2013 г. над Беларуссю, напаўняюць «унутраны маналог» дзяцей, якія спяваюць вясновую песню:

— Плачэ, плачэ салавейко:
— Бура лясы поваляла,
— Дай гняздзечкі паскідала.
— Не плач, не плач, салавейко,
Будуць яшчэ вышэйшыя
Дай гняздзечкі цяплейшыя.
*(в. Закальное, Любанскі р-н,*
*запісаў С. Выскварка)*

А ўражанні ад зімы 2013 г., якая зацягнулася, ідэнтычныя сюжэту песні пра ластаўку:

— Ластовонько, ты чернэнькая,
Чого рано ты з выр'я вышла?
Шчэ й по горам да снягі лыжыць,
По долынам да крыгы стоець.

— А я того да й нэ боюся,
— Я сныгі лапкамы розгрыбу,
— Я крыгы крыльцямы розоб'ю.
*(в. Новая Попіна, Драгічынскі р-н)*

У «Калыханцы» песня падмацавана эмацыянальнымі ўражаннямі з рэальнага жыцця. Сучасны чалавек падчас спеваў цалкам можа думаць пра тое, пра што мог думаць і яго далёкі продак. Так знаходзіцца адпаведнасць паміж выканаўцам і выкананым старадаўнім тэкстам.

Аўтэнтычныя спевакі ў ансамблі імкнуцца асабіста данесці сюжэт песні, быць пачутымі. Ад гэтага нават аднагалосныя спевы становіцца фактурнымі, «квяцістымі». Іх нават цяжка назваць аднагалоснымі, паколькі яны маюць розныя тэмбры і эмацыянальныя пасылы.

Унутраная насычанасць, адкрытасць — натуральныя і звыклыя якасці народных спевакоў. У сучасных юных спевакоў такія выканальніцкія характарыстыкі напрацоўваюцца паступова. Ансамбль «Калыханка» назапасіў дзейсныя практыкаванні для такога трэнінгу.

У тэатральнай практыцы ёсць паняцце «адрасны пасыл». Не менш важны ён і ў фальклорнай практыцы. Гаворка чалавека заўсёды мае адрасата. Асабліва гэта заўважна ў вёсцы. Калі суразмоўца стаіць перад табой — гэта адзін пасыл. Калі ён у цябе за спіной — гэта іншы пасыл. Ён можа быць у суседнім пакоі, на вуліцы, далёка ў полі або ў лесе, на высокай гары, у глыбокай лагчыне і г.д. Для напрацоўкі правільнага пасылу гуку ансамбль «Калыханка» выкарыстоўвае многія фальклорныя жанры.

Калыханкі прывучаюць спевака выкарыстоўваць мяккі, лёгкі, ахутваючы і, як мы кажам у ансамблі, «неагрэсіўны», «не калючы» гук.

Вясновыя песні — «гуканне вясны» — пасылаюцца «за гарызонт», туды, дзе «спіць» Вясна. Да яе трэба дакрычацца і абудзіць:

Аго, Вясна, аго, красна…

Купальскія песні пасылаюцца ў неба — туды, куды ляцяць іскры ад купальскага вогнішча:

Купалейко, ноч маленька.

Масленічныя песні адрасуюцца як быццам плошчы. У «Калыханцы» адпаведнае практыкаванне называецца «Глашатай». Дзеці разварочваюць уяўны «світак» і зачытваюць яго ўяўнаму «народу на плошчы»:

У нас сягодня Масляніца,
прыляцела ластавіца.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вясельныя песні спяваюцца свайму роду, і пасыл высокіх галасоў адрасаваны двару, дому, людзям на ім:

Ласы сват наш, ласы…,
Стукнула-грукнула на дварэ…

У практыцы ансамбля «Калыханка» для напрацоўкі правільнага «адраснага» пасылу выкарыстоўваюцца гульні: «Гусі, мае гусі», «Мак», «Пастух і авечкі». Сфарміраваць правільны пасыл дапамагае расказванне казак, дзе заўсёды ёсць пераклíканне герояў:

Ня бачылі зайцоў, ваўкоў, мядзведзяў?
Паляванне будзе!
*(казка «Пра паляванне» Л. М. Цыбульскай;*
*запісала Л. Рыжкова)*

Гусі, мае гусі!
Скіньце мне па перцу.
Ў майго бацькі засекі аўса,
Мора вады.
Будзем піць і есць!
І я ж з вамі палячу.
*(казка «Пра Пілíпку» Л. М. Цыбульскай;*
*запісала Л. Рыжкова)*

Падчас канцэртаў дзецям рэкамендуецца адрасаваць спевы ўяўнаму «жаваронаčку ў небе», «салавейку на дубе», «ластавачцы, што ляціць з выраю». Калі дзіця на сцэне сапраўды адчувае жаўрука, які ляціць у небе, спячую за гарызонтам Вясну, то і гледачы згодна эмацыянальнаму водгуку адразу адчуюць сябе там, куды іх паклікалі ў сваёй фантазіі. Чароўная сіла акцёрскага мастацтва ўсё зробіць за дэкаратара і рэквізітара і, безумоўна, напоўніць праўдай і мастацкімі вобразамі твор.

Выходзячы на сцэну, дзеці з ансамбля бачаць гледачоў у зале і пачынаюць ім «распавядаць» песню і нават паказваць яе. Гэта адбываецца таму, што ў «Калыханцы» шырока выкарыстоўваецца тэатральны метад беспрадметных фізічных дзеянняў з сістэмы К. С. Станіслаўскага. У народнай культуры для большай выразнасці і казачнікі, і пераказчыкі, і спевакі часта пантамімічна малююць працоўныя працэсы, звычкі звяроў, пластыку людзей. Гэта дапамагае тэатралізацыі дзеі, набліжае апісваемыя абставіны да слухача, гледача. Часта на сцэне пантамімічны малюнак працэсу прадзення нітак выклікае значна большы эмацыянальны водгук, чым вынас на сцэну рэальных калаўротаў. У дакладным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жэсце больш праўды мастацкага вобраза і больш тэатралізацыі. Калаўрот жа лепш пабачыць у музеі.

Песня не статычная. Яе дзеянне адбываецца ў розных месцах: у хаце, поле, агародзе, лесе, на вадзе, вайне ... Песня, падобная да кіно: дэкарацыя адна не падыдзе, а вось пантамімічныя, пластычныя намёкі на зменлівыя месцы дзеяння цалкам адпавядаюць спецыфіцы фальклорнага мыслення.

Часта на рэпетыцыі кіраўнік ансамбля жэстамі, мімікай, пластыкай «намякае» дзецям на абставіны, пра якія распавядае песня. Тут гэтая пантаміма выконвае функцыю рытмічнай арганізацыі, дырыжыравання.

«Пасу, пасу авечачкі, недалёка ад рэчачкі...» — малюем ідучага пастуха, які размахвае пугай альбо з пагрозай хвастае ёй па зямлі або які абапіраецца на палку, які гладзіць авечку, расстаўляе рукі, каб зганяць авечак у кучу, заганяць у вароты... Усе гэтыя дзеянні будзяць фантазію дзяцей, дапамагаюць ім адчуць сябе «тут і цяпер», рытмічна арганізуюць спевы, робяць відавочным пульс і сэнс жыцця, пра якую распавядае песня.

На сцэне кіраўнік ужо так не дырыжыруе. Кожнае дзіця само можа, калі захоча, падмацаваць свой «аповед» у ансамблевай песні жэстам. Гэта ў нас не забаронена і не рэгламентавана, а ўзнікае спантанна, пры гэтым забяспечвае правільны «пульс» і настрой.

Гульня, якую ладзяць вакол песні, дапамагае адцягнуць дзіця ад працэсу спеваў, перанесці яго ўвагу на тэкст, логіку і інтанацыю выказвання, якое, па нашым перакананні, перш за ўсё вызначае народную песню.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ